Т. У. Ганчарова-Цынкевіч (Мінск, БДПУ)

УДК 821. 161.3

# СУЧАСНАЕ ПРАЧЫТАННЕ П’ЕСЫ ЯНКІ КУПАЛЫ “РАСКІДАНАЕ ГНЯЗДО”

Анатацыя

В статье автор анализирует пьесу Янки Купалы «Раскиданное гнездо» с позиций современного прочтения.

Талент Янкі Купалы як драматурга раскрыўся ўжо тады, калі з-пад яго пяра выйшлі такія выдатныя п’есы, як камедыя “Паўлінка” (1912) і драма “Раскіданае гняздо” (1913). Падзеі, адлюстраваныя ў п’есе “Раскіданае гняздо”, адбываюцца ў 1905 годзе, калі капіталізм у краіне прывёў да поўнага разарэння працоўнага сялянства. Гэты твор адлюстроўвае пакутлівы шлях беларускага сялянства ў пошуках страчанай бацькаўшчыны і лепшай долі. Сюжэт драмы грунтуецца на сацыяльным канфлікце – сутыкненне сям’і Зяблікаў з панам. Дзеянне разгортваецца ў двух планах: пошукі Сымонам “зямлі ў сваёй старане” і каханне Зоські. Я. Купала таксама выразна пазначае і сямейны канфлікт: няма паразумення паміж Марыляй і яе старэйшымі дзецьмі Зоськай і Сымонам. Найвышэйшай кропкі напружання сюжэт дасягае ў чацвёртай і пятай з’явах чацвёртага акта, калі перад Сымонам паўстала задача выбару – ісці з незнаёмым на “вялікі сход” ці застацца з маці. П’еса мае некалькі сюжэтных ліній, аднак мнагапланавасць не перашкодзіла аўтару сканцэнтраваць падзеі вакол Сымона, з вобразам якога і звязана галоўная думка твора. На эвалюцыі гэтага вобраза Я. Купала прасачыў рост абуджэння палітычнай свядомасці беларускага сялянства.

Пытанне аб жанравай прыналежнасці “Раскіданага гнязда” да сённяшняга дня турбуе даследчыкаў нашай нацыянальнай літаратуры, таму што ад выражэння яго залежыць канцэпцыя твора. Сам пісьменнік вызначыў жанр “Раскіданага гнязда” як “драма”. Большасць навукоўцаў прымаюць такое вызначэнне, аднак пры гэтым робяць удакладненні – сацыяльна-бытавая драма, сацыяльна-філасофская драма, нават трагедыя. Цалкам пагадзіцца з гэтым нельга, бо ў творы парушаны класічныя формы трагедыі, дзе самае страшнае павінна адбыцца ў канцы твора.

Так, у п’есе прысутнічаюць элементы трагедыі: разбурэнне хаты Зяблікаў, самагубства Лявона. Катастрофа адбываецца ў фінале твора. Астатнія дзеі апавядаюць пра спробы сям’і Зяблікаў адстаяць сваю хату і зямлю, пра пошукі справядлівасці, знайсці

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

сваё месца ў гэтым свеце. Фінал “Раскіданага гнязда” дае надзею на новае жыццё. Чытач не адчувае нейкай безнадзейнасці. Жанравая прырода твора складаная і неадназначная. Лявон – трагічны герой, які выклікае спачуванне. Яму не хапіла жыццёвай сілы, каб знайсці праўду ў жыцці і тым самым выйсці з тупіковай сітуацыі. Самагубства Лявона сімвалізуе бесперспектыўнасць філасофіі і пакорлівасці, якая панавала над многімі пакаленнямі папярэднікаў і гэта трагедыя адлюстроўвае глыбокія супярэчнасці жыцця. Аднак у гэтым моманце трагізму ёсць і прасвятленне, калі перад смерцю герой дае параду свайму сыну Сымону: “Трэба праўды шукаць не тапаром, а розумам. Дзед твой не меў розуму, я не маю, але ты яго мей, каб часам цябе і тваіх дзяцей не ганялі гэтак, як сягоння” [1, с. 357].

Трагедыя адбылася, смерць Лявона сімвалізуе канец сялянскіх ілюзій і пачатак новага этапа ў барацьбе за зямлю і волю. Сюжэтная лінія, звязаная з Лявонам, з’яўляецца экспазіцыйнай часткай п’есы. Тут мы знаёмімся з усімі персанажамі, акрамя Паніча і Незнаёмага, даведваемся, што старой хаты не адбудуеш, што трэба нейкім чынам ладзіць далейшае жыццё. Для кожнага персанажа адкрываецца свой шлях пошуку праўды і сэнсу існавання. Я. Купала праз сімвалістычную вобразнасць малюе ўнутранае “я” кожнага з іх. У п’есе вобразы-сімвалы ўтвараюць першы план. Аднак “Раскіданае гняздо” мае і моцны рэальны падмурак: сюжэт драмы мае аўтабіяграфічную аснову.

Цікавым і самастойным у творы з’яўляецца вобраз-сімвал шляху як адлюстраванне ўласнага лёсу пісьменніка, так і пошук адвечнага шчасця беларускага народа. Гэты пошук свайго шляху ў жыцці развядзе потым дарогі ўсіх персанажаў п’есы.

Па свайму светапогляду да Лявона стаіць яго жонка Марыля. Даследчыкі ў яе характары перш за ўсё вылучаюць рысы пакорлівасці і цярплівасці, трактуючы гэта як тыповыя рысы нацыянальнага характару, пакідаючы па-за ўвагай, што слова “цярпенне” яшчэ азначае і здольнасць стойка пераносіць удары жыцця. Заўсёды мала ўдзялялася ўвагі набажнасці Марылі, яе хрысціянскай міласэрнасці. Калі разбураюць хату, яна звяртаецца да іконы: “... Асвяці ты, божа, душу маю грэшную, не пакінь майго ўдовінага сіроцтва, - пашлі мне сілачкі гэтых малых выхаваць! Укрый іх ад галоднае і халоднае смерці і ад благіх людзей укрый іх, божа!” [1, с. 361]. Гераіня не робіць ніякай справы без імя Бога, яе маналогі гучаць як пераказ хрысціянскіх запаветаў. Дзецям яна імкнецца перадаць сваю пяшчоту, дабрыню, спагаду і міласэрнасць. Звяртаючыся да Сымона: “Нічога, сынку! гэта пройдзе, гэта толькі жаль вялікі праз цябе гаворыць... Цяжанька цяпер табе, - дык і каму з нас сягоння тут лёганька, - але што чыніць? Памучышся які месяц-другі, прыдаўлены сваім сіроцтвам і адзіноцтвам, месяц-другі будзеш сноваць, як тапельнік між жывымі, не знаходзячы сабе прыстанішча, а там, за які гадок, як зацвітуць на вясну першыя кветкі над

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

бацькавай вечнай пасцеляй, - зацвітуць краскі і ў цябе на душы і на сэрцы, светлыя краскі ціхага спакою і журбы святой. Будзеш далей жыць і шукаць шчасця на свеце” [1, с. 363-364]. Словы Марылі па-народнаму мудрыя, афарыстычныя, вобразныя і ў той жа час нясуць надзею на спакой і згоду. Гераіня ў творы ўзнята аўтарам да вобраза-сімвала сумлення Бацькаўшчыны. Аднак Я. Купала не абсалютызаваў вобраз Марылі. Па сюжэту драмы бачым, што жанчыну напаткаў шлях жабрацтва. Гэты шлях таксама напоўнены шматзначным сэнсам і дапускае розныя тлумачэнні. У дачыненні да Марылі і яе дзяцей Зоські і Данілкі жабрацтва не выглядае прыніжэннем, хутчэй за ўсё гэта своеасаблівае разняволенне духу, якое з’яўляецца сімвалам выратавання і надзеі на шчасце. Відаць таму, у “Раскіданым гняздзе” яшчэ адзін персанаж – Старац, сваё жабрацтва ўяўляе як вечнае вандроўства ў імя новага і лепшага на зямлі: “Там добра, дзе нас няма. Але ў маім жабрачным палажэнні ўсюды някепска... Цэлы свет – хата мая, усе людзі – радня мая, уся зямелька – поле маё роднае. Усюды што-колечы ды сваё знаходжу: ці кусочак хлеба, ці куток цёплы для начлегу, ці толькі так добрае слова – і за гэта дзякуй богу! Іду сабе ды іду. Ні над чым не трасуся, нічога бараніць не маю: усё багацце са мной у гэтых торбах – гэтыя акрайчыкі хлеба ды часам які кусочак сыру ці сала...” [1, с. 400].

Але зразумела, што жабрацтва для Марылі і яе дзяцей гэта не толькі разняволенасць і свабода, гэта яшчэ і беззямелле, нястача, неабароненасць, галеча і холад. Малюючы вобраз Марылі, якая стала жабрачкай Я. Купала падымае яе да вобраза-сімвала Маці-Беларусі, якая таксама са сваімі дзецьмі стала жабрачкай.

Тэма лёсу мастака з народу раскрыта аўтарам на вобразе Данілкі. У п’есе на фоне іншых персанажаў, яго шлях – адметны. Гэта яшчэ падлетак, але ён самы незалежны ў творы. Данілка ідзе не за Сымонам і Зоськай, а за маці і Старцам, каб убачыць свет, жыццё, атрымаць вопыт і з цягам часу стаць сапраўдным музыкай. Хлопчык упэўнены, што ўсе з цягам часу зменіцца, хараство і гармонія будуць валадарыць у свеце, калі ён зайграе на сваёй скрыпачцы. Шлях абраны Данілкам – шлях творцы. Я. Купала пакідае адкрытым пытанне аб тым, як складзецца лёс героя, калі настане яго зорны час, але абсалютна зразумела, што яго шлях не будзе тупіковым.

Самы дзейсны і рашучы вобраз у п’есе – Сымон. Па закліку Незнаёмага яму хапае сілы рушыцца ў невядомы шлях на Вялікі сход, хоць сам ён не ўсвядоміў яшчэ куды ідзе. Асноўныя рысы яго характару – смеласць, рашучасць, непакорлівасць. Мова яго заўсёды мае клічную інтанацыя. Як і яго бацька, ён цесна знітаваны з зямлёй. За сваю зямлю ён гатовы на ўсё: “Я свайго толькі буду бараніць!” [1, с. 357]. Герой свядома падпальвае панскі маёнтак, аднак на Вялікі сход ідзе не сам, а па волі Незнаёмага. Я. Купала не паказвае да чаго прывядзе абраны шлях Сымона, які гатоў стаць у рады барацьбітоў за

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

зямлю і волю, тым самым падкрэслівае, што гэты шлях толькі адзін з варыянтаў пошуку ісціны.

Шляхі сям’і Зяблікаў разбегліся, але недзе яны перасякуцца, таму што няма ў дарог канца. Аналізуючы вобразы “Раскіданага гнязда” можна з упэўненасцю гаварыць, што Я. Купалу-гуманісту ўласціва хрысціянская эстэтыка. У яго творчасці арганічна спалучаліся сімволіка міфалагічных уяўленняў і абрадавая паэтыка. Купалаўскі свет персанажаў – гэта космас, пабудаваны з уяўленнямі прастору і часу, дзе ўсё знаходзіцца ў руху і шматгалоссі, дзе няма прынятых пастулатаў, а ёсць нечаканая аўтарская думка.

Літаратура


1. Купала, Я. Паэмы. Драматычныя творы / Я. Купала. – Мінск : Маст. літ., 1989. – 494с.
2. Шаўлоўская, М. Беларуская драматургія / М. Шаўлоўская. – Мінск : Народная асвета, 1981. – 1.


--------------------------------------------------------------------------------

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ